PolotskSU



6. Отличительной особенностью пословиц с референциями к природе, актуальных для Полотчины сегодня, является наличие среди них таких, которые представляют жизненный опыт женщины. Примечательно, что жизненно важные истины, реализованные в таких пословицах актуальны для говорения на Полотчине независимо от гендерной идентичности говорящего субъекта и используются для отражения реальности как мужчинами, так и женщинами. В сопоставляемых с городским пространством Полотчины языковыми сообществами других культур подобная особенность не прослеживается.

**Список использованных источников**


1. Караткевіч, У. Хрыстос прызямліўся ў Гародні / У. Караткевіч. Збор твораў у 8 т. Т. 6. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990, – 496 с.
2. Apperson, G.I. The Wordsworth Dictionary, of Proverbs / G.I. Apperson L. – L. : Wordsworth Edition Ltd, 1993. – 721 p.
3. Crystal, D. The Cambridge Encyclopedia of language / D. Crystal. –2nd ed. – UK : Cambridge University Press, 2003. – 480 p.
4. Брыль, Я. З людзьмі і сам – насам / Я. Брыль. Мн. “Мастацкая літаратура”, 2003 – 334 с.
5. Лясовіч, С.М. Канцепт “жанчына” у беларускіх парэміях / С.М. Лясовіч // Гендер и проблемы коммуникативного поведения. Новополоцк : ПГУ, 2016. – С. 144-147
6. Пражский лингвистический кружок / Сб. статей. – М. : Наука, 1967. – 306 с.


**REFERENCES TO NATURE IN PROVERBS AND SAYINGS OF POLATSK REGION. GENDER PERSPECTIVE**

M. POUTROVA

*References to nature are characteristic of a considerable number of proverbs and sayings registered in authentic talking in the urban area of Polatsk region nowadays. The frequency of their usage is not a distinctive feature of Polatsk talking for it is very much the same as the frequency of proverbs with references to nature registered in similar English, American or Russian regions. Gender identity of speaking subjects doesn't bring about any notable changes in the frequency of the proverbs either. Nor is there any sexism in the analysed proverbs. Their distinctiveness is in the recurrent connotations of prime importance of hard work, patience, endurance as well as of possibility of positive changes. The connotations can be summed up in the form of the saying "We'll survive". References to nature in some of the proverbs highlight women's experience and the truths it brings about as well as the importance of good relationships among men and women and claim that concession to women should be an efficient means of establishing such relationships. The figure of mother is compared to that of the sun.*

***Key words:*** *overall frequency, nonsexism, hard work, patience, positive changes, endurance, concession, female experience, mother, the sun.*

УДК 39 (476-22) (091)

**ПРАБЛЕМЫ ХАРЧОВАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ)**

**Сумко А.В.**
Рэспубліка Беларусь, Наваполацк,

*Разглядаюцца пытанні, звязаныя з харчовым зебеспячэннем беларускай вёскі ў першыя гады пасля вызвалення. У якасці крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі, якія дазволілі зразумець спецыфіку абранай праблемы, яе адлюстраванне ў калектыўнай памяці вясковага насельніцтва Віцебшчыны.*

***Ключавыя словы:*** *сістэма жыццезабеспячэння, збіральніцтва, голад, беларуская вёска, харчаванне, вусная гісторыя.*

**Уводзіны.** Першыя пасляваенныя гады – адзін з самых складаных, супярэчлівых і недастаткова даследаваных перыядаў у гісторыі беларускай вёскі. Праблема харчовага забеспячэння беларускай вёскі ў першыя пасляваенныя гады не стала прадметам асобнага даследавання. Яна ўскосна разглядалася ў працах айчынных этнографаў, напрыклад, у рэчышчы гісторыі кухні [1] ці растваралася ў тэмах, якія ахоплівалі больш вялікі перыяд [2]. Тэма недастатковасці харчовых рэсурсаў у беларускай вёскі закранался ў працах гісторыкаў, якія займаліся складанай пасляваеннай рэчаіснасцю. Напрыклад, Ірына Кашталян на падставе дакументаў былых сакрэтных вопісаў партыйнага фонду раскрывае праблему пасляваеннага голада і стратэгій выжывання насельніцтва [3], а Ян Шумскі ў сваім даследаванні “Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944 – 1953 гг.)” прыводзіць звесткі пра выкарыстанне ў ежу ў раёнах найбольш пацярпелых ад нацыстскай акупацыі лебяды, бярозавай і сасновай кары, а таксама адзначае, што пасляваенны голад выклікаў хвалю міграцый у больш заможныя раёны, пераважна ў заходнія раёны Беларусі [4, с. 101–102].

Геаграфія даследавання – сучасная тэрыторыя Віцебшчыны, якая ў пасляваенны час складалася з двух абласцей: Полацкай і Віцебскай. Рэгіён меў у сваім складзе раёны з рознымі тыпамі сацыяльна -эканамічнага ўкладу (раёны з перавагай аднаасобных гаспадарак і цалкам калектывізаваныя раёны), розным узроўнем дабрабыту насельніцтва і неаднолькавымі стартавымі ўмовамі пасляваенага аднаўлення. Вывучэнне праблемы на прыкладзе пэўнага рэгіену дае магчымасць дэталёва вывучыць і прааналізаваць праблему. Храналагічныя межы ахопліваюць не толькі першыя гады пасля вызвалення, але 1946/47 год, калі няўроды актуалізавалі праблему харчовага забеспячэння.

**Асноўная частка.** Чалавечыя і матэрыяльныя страты падчас вайны, скарачэнне пасяўных плошчаў, ураджайнасці – адмоўна адбілася на стане пасляваеннай вёскі. У вельмі складаных умовах апынуліся жыхары раёнаў, тэрыторыя якіх стала эпіцэнтрам карных экспедыцый. Шэсць раёнаў Полацкай вобласці (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі) і сем раёнаў Віцебскай (Гарадоцкі, Дубровенскі, Сіроцінскі, Суражскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Мехоўскі) былі ўключаны ў лік 36 найбольш пацярпелых ад нацыстаў на тэрыторыі БССР [5, л. 10]. Многія засталіся без прытулку і сродкаў існавання, надзённая праблемай стаў крытычны недахоп харчовых рэсурсаў.

Забеспячэнне прадуктамі харчавання жыхароў сельскай мясцовасці практычна не ажыццяўлялася. Пасляваенная вёска па сутнасці, жыла самазабеспячэннем. Цэнтралізаванай выдачы хлеба ў вёсцы не існавала, хоць невялікі рэзервовы фонд у калгасах і

PolotskSU



саўгасах меўся, прызначаны быў перш за ўсё для прадстаўнікоў сельскай інтэлігенцыі, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны і грамадзян, эвакуяваных з прыфрантавых абласцей. Аднак, як сведчаць успаміны, нават гэты мінімум не заўсёды быў даступны. Пасляваенны хлеб – гэта тэма асобнага даследавання. Рэспандэнты вельмі кранальна ўзгадваюць пра яго: "*После ж войны голад, холад. Хадзілі, сабіралі бульбу с зімы, перакапавалі гэтую зямлю, іскалі і шчавель, і траву, і крапіву, і ўсе, дзе ж толькі было. А тады сталі хлеб даваць у горадзе, і дзяліць па кусочку. Хадзілі на нач у вочарадзь, занімалі вочарадзь. Стаім, стаім, начавалі, а вочарадзі по кіломітру, па два. Нясешь гэты кусочак дамоў, і ня возмішь, не хваціць ужо, едзешь і так. А нада ж дамоў данесці гэты кусочак, а усім нада раздзяліць і хочаца,і дзяржышь яго і нясешь дамоў"* (Лепельскі р-н). [6].

Для селяніна-калгасніка асноўнай крыніцай матэрыяльнага забеспячэння з'яўляліся паступлення ад працы ў калгасе ці саўгасе за так званыя працадні, якія аплочваліся ў натуральным ці грашовым выражэнні. Вяскоўцы ў сваіх успамінах падкрэслівалі, што атрымаць грошы за працу ў пасляваенным калгасе было практычна немагчыма, а рэальныя сумы выплат былі мізэрнымі. Фактычна гэта была натуральная сістэма аплаты, якая залежала ад ураджайнасці, стану калгаснай гаспадаркі і ад таго, што і колькі заставалася пасля выканання абавязковых дзяржаўных паставак. Крытычную сітуацыю з аплатай працадзён у першыя паваенныя гады падцвярджаюць архіўныя дакументы. Напрыклад, у дакладной запісцы сакратару Полацкага абкама КП(б)Б ад 25 студзеня 1946 г. паведамлялася, што ў Асвейскім раёне пасля таго, як калгасы разлічыліся па ўсіх відах хлебапаставак з дзяржавай толькі ў пяці калгасах былі засыпаны насенныя фонды і выдадзена авансам калгаснікам ад 200 да 500 грам на працадзень (200 чалавек), у астатніх 69 калгасах (7 898 чалавек) насенныя фонды засталіся не запоўненымі і на працадні нічога не было размеркавана [7, л. 1]. Ва ўспамінах вяскоўцаў пра першыя пасляванныя гады тэма крытычнага недахопу харчовых рэсурсаў гучыць вельмі часта. Рэспандэнты адзначалі, што выплаты за працадні ў калгасах нават у мінімальнай ступені не забяспечвалі патрэбы сялянскай сем'і: "*Да вайны нічога было, і робілі, і стараліся, а пасля вайны галадавалі крэпка, цяжка было жыць. Калок запішуць. Давалі на яго якого хлеба. А які хлеб быў? Гірса была. Трудадні, ну як валы робілі"*(Полацкі р-н) [8]. У такіх умовах асноўную ролю ў жыццязабеспячэнні сялян адыгрывала ўласная гаспадарка і прысядзібны ўчастак, прычым гэта было характэрна як сялян-калгаснікаў, так і для сялян-адзінаасобнікаў. Распараджацца сваёй прадукцыяй гаспадар мог па сваім меркаванні, выплачваючы пры гэтым сельскагаспадарчы падатак. Разам з тым, у першыя пасляваенныя гады падаткі для адзінаасобнага сектара істотна ўзраслі, што адбілася на спажыванні селяніна-аднаасобніка, бо амаль усё ішло на продаж, каб пагасіць плацяжы. Неабходна адзначыць, што аб'ёмы спажывання знаходзіліся ў залежнасці ад уражайнасці і структуры пасеваў сельскагаспадарчых культур. У першыя пасляваенныя гады назіралася тэндэнцыя да мінімізацыі намаганняў і выдаткаў: аддавалі перавагу тым сельскагаспадарчым культурам, якія давалі вялікую аддачу ў самыя кароткія тэрміны.

Аднак не заўсёды і прысядзібны ўчастак мог дапамагчы селяніну, асабліва пасля вяртання на папялішча. У надзвычайным становішчы апынуліся тыя, хто прыязджаў з нямецкага палону або эвакуацыі, бо яны не мелі ўласных харчовых запасаў і не маглі разлічваць на ўраджай са сваёй сядзібы. Калгасы, адноўленыя ў першы год пасля вызвалення, таксама знаходзіліся ў цяжкім стане, асабліва ў раёнах найбольш пацярпелых ад нацыстаў, таму магчымасці эканамічнай дапамогі былі вельмі абмежаваныя. У экстрымальных жыццёвых умовах жыхары спаленых вёсак выпрацоўвалі розныя адаптыўныя практыкі, каб вырашыць праблемы з харчаваннем. Адной з іх было вымушанае жабрацтва: *"...хадзілі часта – з'ядзём і пайшлі апяць...і саседзі хадзілі з намі"* (Полацкі р-н) [9]. Рэспандэнты ўзгадвалі, што вымушанае жабрацтва мела мэтай атрымаць не толькі "кавалак надзённага хлеба", але і жыццёва неабходныя рэсурсы для будучага ўраджаю (зерне, бульба, семя). Палявыя даследаванні фіксуюць успаміны пра жабрацкія практыкі ва ўсіх раёнах Віцебшчыны. Прычым аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі паказвае, што калі ва ўсходніх раёнах успаміны пра пасляваеннае жабрацтва – гэта ўспаміны пра ўласны жыццёвы досвед, то ў заходніх пераважаюць успаміны сведкаў гэтай з'явы [ 10, с. 143].

Істотным фактарам, які адбіваўся на ўзроўні спажывання, з'яўляліся пасляваенныя неўраджаі, якія былі вынікам неспрыяльных умоў надвор'я ў 1945 і 1946 гадах. Напрыклад, у тым жа Асвейскім раёне ў 1945 г. на працягу двух тыдняў ішлі штодня праліўныя дажджы, якія прывялі да разлівання вадаёмаў і знішчылі фактычна ўвесь ураджай [7, л. 12]. Матэрыялы фальклорнага архіва Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта таксама падцвярджаюць інфармацыю пра ўплыў неспрыяльных умоў надвор'я на стан харчовага забеспячэння і больш таго, фіксуюць, што пагроза смерці ад голаду ў разглядаемы перыяд стала надзённай праблемай. Прыродныя катаклізмы ўскладнялі сітуацыю з харчовым забеспячэннем у найбольш пацярпелых раёнах рэгіёну, дзе працэсы аднаўлення гаспадаркі ішлі марудымі тэмпамі. Гэта знаходзіла і адлюстраванне ў розных справаздачах. Напрыклад, журналіст цэнтральнай савецкай газеты "Праўда" паведамляў галоўнаму рэдактару сваё ўражанне ад прыезду ў Беларусь вясной 1946 г.: "Я посетил также восточные районы БССР, в Освейском районе в колхозе "Красные стрелки" люди едят лебеду, березовую и сосновую кору, и это 2 года после освобождения! " [4, с. 102].

У пасляваенны час не хапала базавых прадуктаў харчавання. Па ўспамінам рэспандэнтаў мясныя, малочныя прадукты, тлушч, цукар амаль зніклі з ужытку. Пашыраным было выкарыстанне ў ежу розных раслінных сурагатаў. У выніку гэта прывяло да рэзкага скарачэння неабходнай колькасці харчовых раслінных і жывёльных прадуктаў у сутачным рацыёне вясковай сям'і, і як вынік недаатрымання з ежай неабходных для здароўя чалавека рэчываў: бялкі, мінеральныя солі, вітаміны і інш. Абгрунтаваныя навуковыя нормы спажывання прадуктаў харчавання, атрыманыя ў 1939 г., уключалі наступныя паказчыкі (на 1 чал. у год, кг): хлебапрадукты — 121, бульба — 114, гародніна і бахчавыя — 141, малако і малочныя прадукты — 540 [11, с. 85], у пасляваенныя гады не вытрымліваліся.

Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць, што менавіта дзікарослыя расліны, ва ўмовах недахопу базавых прадуктаў, з'яўляліся ў пасляваенны час вырашэннем праблемы харчавання. Прычым рэестр спажывання быў значна пашыраны за кошт тых зёлак і раслін, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту практычна не выкарыстоўваліся ў ежу (шчавульнік, асака, лебяда, хвошч і інш.) [12, с. 184]. Акрамя травы, якую спажывалі з вясны, распаўсюджаным харчовым рэсурсам былі разнастайныя ягады і грыбы - харчовы рэсурс, які немагчыма было здабыць на ўласных палетках: "*Як тока начынаюцца вот эта, мы тока гэтым і жылі. Лесам. Гэта ўжо былі вот так наеўшысь*" (Полацкі р-н) [13]. Збіральніцтва давала неабходны мінімум, які дазваляў чалавеку не памерці з голаду і пратрымацца да новага ўраджаю: "*Был очень страшный голод один сезон, пока новой картошки не дождались. Нас выручал щавель. Всех выручал. Мы ходили дети, мама с бабушкой – на работе, а мы ходили с мешками под Дрису и под Двину, ... мешками таскали щавель, а мама варила и делала лепёшки. Из мешка получалось вот столько (показывает горсточку)*" (Верхнядзвінскі р-н) [14]. Уключэнне ў паўсядзённы пасляваенны рацыён дзікарослых раслін і раслінных прадуктаў – сурагатаў больш актуальным было для жыхароў ўсходніх раёнаў Віцебшчыны, якія былі найбольш спустошаны пасля вайны, аднак матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што і ў заходніх раёнах рэгіёну збіральніцтва было таксама значна пашырана: "*Як выжылі? – Лебяду, крапіву елі. У ягады хадзілі.*" (Міёрскі р-н) [15].

PolotskSU



Прадукты збіральніцтва давалі неабходныя белкі і вітаміны, што дазваляла пэўным чынам выправіць дысбаланс у сістэме харчавання. Напрыклад, крапіва, выкарыстанне якой у ежу было вельмі распаўсюджана ў веснавы перыяд, з'яўляючыся своеасаблівым прыродным полівітамінным канцэнтратам, давала арганізму пэўную долю аскарбінавай кіслаты, вітамінаў К, $B_2$ і іншыя карысныя рэчы, а насенне крапівы ўтрымлівала да 32, 4 % тлустага алею [16, с. 219]. У перыяд адноснага дабрабыту ў ежу пераважна ўжывалі маладыя пабегі крапівы, успаміны пра экстрымальныя часы сведчаць, што на гэтую акалічнасць не звярталі ўвагі, аднак крэспандэнты ўсведамлялі ўздзеянне карысных уласцівасцей расліны. “Раньше делали салаты из крапивы. Послевоенное время – варили борщи, они очень полезные, много витаминов. Я показывал внучке, как есть сырую крапиву. Вот так скручиваешь листочки, съедаешь. Получается с одного-двух листочков – дневной рацион витаминов ” [17, с. 160]. Багатым на крахмал, эфірны алей і аскарбінавую кіслату былі карэнні аіра [16, с. 124], якія таксама спажывалі ў ежу: “*Елі, суп варылі… Сабіраеш, перабіраеш, сякеш, кіпятнком ашпарыш і тады, калі есць мука, прыкалоціш, а калі не, так*” (Расонскі р-н)” [18]. Неабходна адзначыць, што збіральніцтва пасляваеннага часу арганічна звязана з усёй сістэмай этнабатанічных ведаў, уласцівых беларускай традыцыйнай культуры, іншымі словамі пошук ядомых раслін адбываўся не хаатычна, а з улікам шматвекавога досведу, на падставе якога была створана арыгінальная сістэма пасляваеннага жыццязабеспячэння.

Акрамя збіральніцтва важнай крыніцай жыццезабеспячэння ў разглядаемы час было рыбалоўства. Рэспандэнты ўзгадваюць, што рыба была важным харчовым рэсурсам, які дазваляў выжыць у складаных умовах, а таксама выступала ў якасці сродка для абмену на іншыя прадукты харчавання. “*Рыба – гэта ж самая еда была*”; “*Лавілі рыбу і рыбы было многа.* – (А лавілі для сябе ці прадавалі?) – *Канешне. Менялі. Восем кілаграм ляшчоў, а яна мне пол ведра бульбы*. – (Пол ведра?) – *Пол ведра, мелкай*.” (Расонскі р-н). [19]. Неабходна адзначыць, што вырашэнне праблемы харчовага забеспячэння было абумоўлена канкрэтнымі прыроднымі ўмовамі мікрарэгіёна, бо ад спецыфікі ландшафту залежаў спектр збіральніцтва і маштаб выкарыстання прыродных рэсурсаў.

Па ўспамінам сельскіх жыхароў Віцебшчыны, вельмі надзённай праблемай у першыя гады пасля вызвалення была адсутнасць солі, якая ў гэты час з’яўлялася адным з самых дэфіцытных тавараў. “(А соль ці была?) – *А дзе яна? Не было.* – (А замест солі, што было?) – *Нічога. Пухлі людзі* (Докшыцкі р-н) [20]. Звычайна яе выменьвалі на прадукты харчавання ці нейкія рэчы. Ва ўмовах крытычнага недахопу харчовых рэсурсаў у ежу выкарыстоўвалі калійную соль: *“Не было солі. А чым мы салілі ці знаеце!? Вот знаеце краснае ўдабрэнне – калійная соль. Неяк мама недзе даставала, гэту соль пераварвала, кіпяціла, а тады працэджвала і гэтай юшкай саліла. Вось як было! Ні сахару не было, нічего ж, не магазінаў не было”*(Міёрскі р-н) [21].

**Заключэнне.** Такім чынам, матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што пасляваенная вёска па сутнасці, жыла самазабеспячэннем. Асноўную ролю ў жыццязабеспячэнні сялян (як сялян-калгаснікаў, так і для сялян-адзінаасобнікаў) адыгрывала ўласная гаспадарка ці прысядзібны ўчастак. Рэспандэнты адзначалі, што ў першыя гады пасля вызвалення адчуваўся недахоп базавых прадуктаў харчавання (хлеб, мяса, малако, соль), а ў раёнах найбольш пацярпелых ад нацыстаў пагроза смерці ад голаду стала часткай рэчаіснасці. Скарачэнне неабходнай колькасці харчовых раслінных і жывёльных прадуктаў у сутачным рацыёне вясковай сям’і, у сваю чаргу, прыводзіла да крытычнага змяншэння неабходных для здароўя чалавека рэчываў. Пэўным чынам выправіць дысбаланс у сістэме харчавання дапамагала збіральніцтва, прадукты якога давалі неабходныя белкі і вітаміны, а таксама рыбалоўства і паляванне. Аднак вырашэнне праблемы харчовага забеспячэння было абумоўлена спецыфікай ландшафту, ад якога залежаў спектр збіральніцтва і маштаб выкарыстання прыродных рэсурсаў. Акрамя гэтага, праблема харчовага забеспячэння вяскоўцаў ў пасляваенны час вырашалася за кошт пэўных адаптыўных практык.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Навагродскі, Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях / Т. А. Навагродскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 243 с.
2. Корзун, И. П. Пища и питание колхозного крестьянства Белоруссии / И. П. Корзун. – Киев, 1963. – 23 с.
3. Каштальян, Ірына. Голад у БССР 1946–1947 гг. ва ўспамінах сведкаў часу // Ірына Каштальян / Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі / Пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука. – Мінск : Зміцер Колас, 2015. – С. 244 – 249.
4. Шумскі, Ян. Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944 – 1953 гг.) / Ян Шумскі. – Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2012. – 362 с.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267.
6. Фальклорны архіў ПДУ (ФА ПДУ): Зап. у 2019 г. ад Кавалёўская Надзея Александраўна, 1937 г.н., у в. Мацюшына Лепельскага р-на.
7. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (далей – ЗДА г. Полоцка). – Ф. 143. Воп. 2. Спр. 25.
8. ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н., в. Мураўшчына Полацкага р-на.
9. ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор’еўны, 1928 г.н., в. Махірова Полацкага р-на.
10. Сумко, А. В. Пасляваеннае жабрацтва ў дыскурсе вуснай гісторыі Віцебшчыны / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки.– 2020. – № 9. – С. 142–147.
11. Чирков, М.С. Жизненный уровень и уровень потребления основных продовольственных и промышленных товаров российских крестьян в 1945 – 1953 гг. / М.С. Чирков // Вестник НИИ гуманитарных наук при Правительстве Республики Мордовия. 2017. № 3 (43). С. 82 – 89.
12. Сумко, А.В. Збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки.– 2021. – № 1. – С.178 – 184.
13. ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад ад Рудзёнак Фёдар Антонавіч, 1937 г. н., в. Загаццe Полацкага р-на.
14. ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Скавародко Елены Усцінаўны, 1937 г.н., в Смулькава Верхнядзвінскага р-на
15. ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Шокель Ліліі Міхайлаўны, 1940 г.н., в. Дворнае Сяло Міёрскага р-на.
16. Шмярко, Я.П. Лекавыя расліны ў комплексным лячэнні / Я.П. Шмярко,І.П. Мазан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 399 с.
17. Кнурэва, Я. С. Дзікарослы раслінны свет у традыцыйных уяўленнях і сучасным жыцці беларусаў / Я.С. Кнурэва. – Мінск : Беларуская навука, 2019. – 207 с.
18. ФА ПДУ: Зап. у 2019 ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
19. ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г.ад Кандрацьева Франца Францавіча, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
20. ФА ПДУ : Зап. у 2009 г. ад Пецько Галіны Сцяпанаўны, 1931 г.н., в. Рачныя Докшыцкага р-на.
21. ФА ПДУ : Зап. У 2019 г. Ад Стомы Яўгеніі Мікалаеўны, 1931 г.н., в. Клімяты Міёрскага р-на.

PolotskSU



**PROBLEMS OF FOOD SUPPLY OF THE BELARUSIAN VILLAGE IN THE FIRST POST-WAR YEARS (BASED ON THE MATERIALS OF THE ORAL HISTORY OF THE VITEBSK REGION**

A. SUMKO

*The issues related to the food supply of the Belarusian village in the first years after the liberation are considered. The sources were oral history materials, which allowed us to understand the specifics of the chosen problem, its reflection in the collective memory of the village population of the Vitebsk region.*
***Key words:** life support system, gathering, famine, Belarusian village, nutrition, Oral history.*

УДК 908:93(314.7.044)

## К НОВЫМ БЕРЕГАМ
## (О ПЕРЕСЕЛЕНИИ ДРИССЕНСКИХ КРЕСТЬЯН С ЗАПАДНОЙ ДВИНЫ НА ЕНИСЕЙ)[1]

**Туманов С.В.**
Российская Федерация, Москва

*Статья представляет собой иллюстрацию продолжительного и сложного исторического процесса переселенчества. На примере конкретной крестьянской семьи из д. Лешково Дриссенского уезда Витебской губернии, корни которой автору удалось проследить до начала XVIII века, показано, как в конце XIX – начала XX века осуществлялось переселение «избыточных» белорусских крестьян на малоосвоенные сибирские просторы Российской империи, трудности в освоении новых земель. Приводятся краткие сведения о судьбах потомках переселенцев.*
***Ключевые слова:** переселенчество, Проходное свидетельство, д. Лешково Дриссенского уезда Витебской губернии, переселенческий участок Кара-Беллык Абаканской волости Минусинского уезда Енисейской губернии; Корзуны, Горбатые (товы), Нарубины.*

**Введение.** На рубеже XIX-XX веков более полутора миллионов белорусских крестьян относились к категории «избыточных», то есть тех, кого родная земля не в состоянии была прокормить при существующей системе хозяйствования на ней. Малоосвоенные просторы Российской империи давали этим людям возможность не просто выживания, но и жизни в определенном достатке. Поэтому только из одной Витебской губернии в 1897 году переселилось, в основном в Сибирь, 3490 человек [1, с. 36].

**Основная часть**. Эта статья представляет собой иллюстрацию продолжительного и сложного исторического процесса переселенчества на примере конкретной семьи, корни которой удалось проследить до начала XVIII века. Речь идет о жителях деревни, которая в одних документах называлась Ляшково, а в других – Лешкова. На карте XIX века это поселение, расположенное на правом берегу Западной Двины, обозначено как Погостье. В административном плане деревня входила в состав Лещиловского сельского общества Филипповской волости Дриссенского уезда, а в экономическом плане долгое время было частью имения Храброво.

В документе под названием «Статистическое описание имения Храброво» (1848 г.) говорится, что пахотная земля (225 десятин, по 4 десятины на душу мужеского полу) в массе своей средняя или худая. Было еще 80 десятин перелоговой земли, которую из-за ее неплодородности пахали не каждый год. Засевали поля хлебом в «удовлетворительном количестве, однако урожай не всегда соответствует ожиданиям, посему крестьяне иногда вынуждены бывают обращаться к ссудам из сельского магазина». Говоря проще, хлеба до нового урожая хватало далеко не всегда. В заключении сказано: «Выгод имения никаких нет, к неудобствам же следует отнести неплодородную почву, весьма скудно вознаграждающую труды земледельца, совершенно худое качество сенокосов и вовсе недостаток леса» [2, л.3-7, 19об-20.об.].

Как известно, государственные крестьяне рано обзавелись фамилиями, но семья, о которой идет речь, именовалась в разных вариациях: в ревизских сказках 1782 и 1850 годов, в инвентаре 1848 года ее представители значатся под фамилией «Калзун». В ревизских сказках 1834 и 1858 годов они записаны как «Карзун», а в документах 1851, 1858 и 1871 годов - как «Колзун». Последняя и окончательная версия этой фамилии – Корзун устоялась только в конце XIX века, и она фигурирует в переселенческих документах.

У первого из известных сегодня представителей этого семейства – Марка – было два сына: Грыгор (1732 г.р.) и Матвей (1737 г.р.). Ветвь Матвея прослеживается до его внуков и потом уже не фигурирует в списках жителей Ляшково. Грыгор и его жена Аксинья оставили после себя сына Василя (1766 г.р.) и четырех дочерей. Три сына Василя (Фома, Тимофей и Станислав), уже обзаведясь собственными семьями, жили одним двором и после смерти отца, образуя интересное, с точки зрения истории пореформенного крестьянства, семейство.

Во многих больших крестьянских семьях на 4-5 пар рабочих рук приходилось с десяток ртов малолетних детей, а у Корзунов 8 человек были в самом активном возрасте от 41 до 14 лет, а трое самых маленьких уже не нуждались в постоянном уходе. В середине века эта «рабочая бригада» имела 1 десятину усадебной, 2 десятины «средней» и 10 «худой» пахотной, 6 десятин сенокосной земли. Позднее она получила еще один надел. В хозяйстве числилось 8 голов рабочего, 7 голов крупного и 27 голов мелкого скота. Лещиловское сельское управление признало его «зажиточным» и благонадежным для «перехода в высшие разряды» [3, л.4.об.].

В 1867 году последним из братьев умер Станислав, несколько лет являвшийся главой семейства. Эта роль перешла к его старшему сыну Лукашу (1836 г.р.), крепкому хозяину, а говоря народным языком, кулаку и выжиге. С одной стороны, в 1871 году он добился от сельского схода закреплением за Корзунами 8 полных участков и 3 огородов, а с другой стороны, начал выживать из дома своих двоюродных братьев. Один из них – Захар Фомич вынужден был обратиться к руководителю

[1] Использованная в статье информация о переселенцах, документы и фотографии из архива М.Ждахиной.

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^1/_8$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.